Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№25

Рабселькоркі, калгасьніцы, саўгасьніцы, актыўным удзелам у конкурсе дапамагайце хутчэйшаму выкананьню дырэктыў партыі і ўраду аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі

(З палажэньня аб Усебеларускім конкурсе на лепшыя калгасныя, малочныя, сьвінагадоўчыя і птушкаводныя таварныя фэрмы).

У мэтах максымальнай мабілізацыі ўвагі партыйных і савецкіх арганізацый і шырокай грамадзкасьці на сваячасовае і поўнае выкананьне важнейшых заданьняў партыі і ўраду па арганізацыі жывёлагадоўчых таварных фэрм, з 20 ліпеня па 15 лістапада 1931 г. абвяшчаецца ўсебеларускі конкурс на лепшыя ў рэспубліцы таварныя фэрмы і лепшыя раёны па арганізацыі іх.

* * *

У конкурсе ўдзельнічаюць усе калгасы, падпісаўшыя дагаворы на арганізацыю таварных жывёлагадоўчых фэрм і іх члены.

* * *

У мэтах выяўленьня найбольш актыўных раённых рэдакцый і рабселькораў у справе мабілізацыі калгасных і грамадзкіх мас на арганізацыю таварных жывёлагадоўчых фэрм і выкананьне заданьняў па здачы таварнай прадукцыі, стварэньні кармовых фондаў, забесьпячэньні жывёлы належна прыстасаванымі памяшканьнямі, ліквідацыю адыхода жывёлы ад хвароб і інш. прычын, пераводу калгасаў на зьдзельна прэміяльную аплату працы і шырокае разгортваньне сацспаборніцтва паміж асобнымі калгасамі, так і ўдарнікамі. Цэнтральнае конкурснае бюро будзе прэміяваць лепшыя рэдакцыі і лепшых рабселькораў па правядзеньні паказанай работы.

* * *

Калгас, які хоча прыняць удзел у конкурсе, павінен не пазьней 20 жніўня падаць адпаведную заяву ў конкурснае бюро свайго раёну. Да заявы павінны быць далучаны наступныя матар'ялы:

а) пастанова агульнага сходу калгасьнікаў аб удзеле калгасу ў конкурсе;

У племгасе імя Леніна Менскага раёну.

б) весткі, зацьверджаныя праўленьнем калгасу аб наяўнай колькасьці на фэрме абагуленай жывёлы (павінна быць паказана па ўзроставых і палявых групах), стане будаўніцтва, забесьпячэньні жывёлы памяшканьнямі (паказаць у процантах), стане кормаздабываньня, выкананьні здачы таварнай прадукцыі і плянавым заданьні па ўказаных паказьніках.

* * *

Прэміі ўстанаўліваюцца наступныя:

ДЛЯ РАЁНАЎ:

а) пераходны сьцяг імя СНК БССР—1 прэмія;
б) легкавая машына—2 прэміі.

ДЛЯ ФЭРМ:

а) грузавая машына—5 прэмій;
б) абсталяваньне для мэханізацыі вытворчых працэсаў фэрмы (даільная машына, запарнік, аўтапаілкі і інш.) 25 прэмій; в) бібліятэчка па палітычных і тэхнічна-жывёлагадоўчых пытаньнях з радыёўстаноўкай і вэтаптэчкай—100 прэмій.

ДЛЯ ЎДАРНІКАЎ:

а) падрыхтоўка і пасылка ў ВНУ—10 прэмій;
б) падрыхтоўка і пасылка ў тэхнікумы — 50 прэмій;
в) экскурсія ў лепшыя ў СССР жывёлагадоўчыя таварныя гаспадаркі—60 прэмій;
г) прэміяваньне дэфіцытнымі прамтаварамі на суму 50 руб.—120 прэмій.

Да 25 жніўня б. г. раённыя бюро павінны прадставіць ЦКБ сьпіс фэрм, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, з далучэньнем да яго паказаных у гэтым палажэньні матар'ялаў і ў далейшым падэкадна інфармуюць аб ходзе работы.

Канчатковая ацэнка работы фэрм і паасобных ударнікаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, робіцца РКБ паводле стану яе на 15 лістапада 1931 г. Форма справаздачнасьці складаецца праўленьнем фэрмы і правяраецца на месцы ў калгасе РКБ ці яго прадстаўніком.

На падставе паказаных справаздач і адпаведных пастаноў РКБ цэнтральнае конкурснае бюро выносіць пастанову аб прэміяваньні. У ЦКБ павінны быць дасланы матар'ялы па ўсіх фэрмах, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, як тым, якія падлягаюць прэміяваньню згодна пастановы РКБ, так і не падлягаючым.

Матар'ялямі для прэміяваньня ўдарнікаў для раённага бюро служаць пастановы агульных сходаў калгасьнікаў, праверапыя прадстаўніком РКБ, а для цэнтральнага бюро паказаныя матар'ялы і пастанова РКБ.

ЦЕНТР. ГОСУДАРСТВЕННАЯ Т.С.С.Р.
Инв. № 15

За актыўны ўдзел у паляпшэньні справы грамадзкага харчаваньня

Сталоўка фабрыкі „Кастрычнік".

Вялікае значэньне ў справе карэннага паляпшэньня забесьпячэньня рабочых мас, зьнішчэньня цякучасьці рабочай сілы і выкананьня прамфінпляну мае грамадзкае харчаваньне.

Грамадзкае харчаваньне ў СССР ахапляе зараз 5 мільёнаў рабочых, 3 мільёны 800 тысяч іншых працоўных у гарадох, 3 млн. дзяцей у школах абслугоўваюцца гарачымі сьнеданьнямі.

Па БССР сетка сталовак у гарадох узрасла з 64 у 1928 - 29 годзе да 235 у 1931 годзе, лік абедаў павялічыўся з 23 тысяч да 240 тысяч.

Аднак, якасьць працы нашых сталовак далёка яшчэ не здавальняе ўзросшых патрабаваньняў мас. **Абеды дрэнна гатуюцца, прадукты псуюцца з прычыны дрэннага хаваньня іх. Абслугоўваючы пэрсанал груба, нядбайна адносіцца да спажыўца. Бруд і антысанітарнае становішча — частыя зьявішчы. Пануюць чаргі. Такое становішча далей цярпець нельга.**

Інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва, культурны рост мас, поўная ліквідацыя беспрацоўя настойліва патрабуюць хутчэйшага пералому ў справе пастаноўкі грамадзкага харчаваньня. Шырокія масы рабочых і служачых і члены іх сем'яў павінны атрымаць магчымасьць цалкам карыстацца грамадзкім харчаваньнем.

ЦК УсеКП(б) прыняў спэцыяльную пастанову аб мерах паляпшэньня грамадзкага харчаваньня.

Грамадзкае харчаваньне выдзяляецца ў аўтаномную сэкцыю спажывецкай каапэрацыі (Усекаапхарч), сталоўкам і прадпрыемствам якога даецца права загатовак.

Дырэктыва ЦК „ня гнаццца за павялічэньнем колькаснага ахопу абедаючых за кошт пагоршаньня якасьці абедаў і ўстаноўленых норм па грамадзкім харчаваньні". „ЦК прапануе разгарнуць шырока сетку дапаможных прадпрыемстваў пры сталовых па сьвінаадкорме, птушніцтве, трусагадоўлі і інш., прычым прадукцыю іх поўнасьцю замацоўваць за сталовымі". Вялікую ўвагу зьвярнуць на санітарнае становішча сталовак. **Вінаватыя ў дапушчэньні антысанітарнага становішча сталовых павінны быць прыцягнуты да судовай адказнасьці.**

Пры РСІ арганізуецца спэцыяльная інспэкцыя з прыцягненьнем работнікаў ДПУ і пралетарскай грамадзкасьці для кантролю над грамадзкім харчаваньнем.

Сталовыя павінны хутчэй перайсьці на гаспадарчы разрахунак. Да гэтага часу з 60 сталовак у Менску толькі 2 пераведзены на гаспадарчы разрахунак.

Час ужо **зьнішчыць безгаспадарчасьць, безадказнасьць у рабоце, ураўнілаўку ў зарплаце.** Неабходна ўвесьці прагрэсыўна-зьдзельную аплату працы работнікам сталовак, абавязкова ўлічваючы пры гэтым якасьць абедаў.

Кухары павінны быць прыроўнены ў зарплаце да кваліфікаваных рабочых у прамысловасьці. ЦК абавязвае закончыць у 1931 годзе пабудову фабрык-кухань і сталовак, прыраўняўшы іх да ўдарнага будаўніцтва. На капітальнае будаўніцтва па грамадзкім харчаваньні БССР на 1931 год было выдзелена Цэнтрасаюзам і Белкаапсаюзам 1.600 т. р., аднак, гэтае будаўніцтва сарвана. Замест 1.600 т. р., адпушчана толькі 100 тысяч р., а на рамонт нічога не адпушчана.

Замест забесьпячэньня сталовак інвэнтаром быў у Менску такі абураючы выпадак, калі 60 бульбарэзак і 60 мясарэзак былі ня выкуплены і вернуты ў Маскву. Да гэтага часу яшчэ няма належнай увагі з боку ўсіх партыйных, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый да справы паляпшэньня і наладжваньня грамадзкага харчаваньня. Неабходна дабіцца хутчэйшага пералому.

Работніцы і жонкі рабочых павінны праявіць актыўнасьць і ініцыятыву ў гэтай справе. **Большым удзелам у грамадзкім кантролі над працай сталовак і канкрэтнай дапамогай у зьнішчэньні недахопаў** даб'емся выкананьня дырэктыў ЦК УсеКП(б).

На працягу 2—3 год лік асоб, якія карыстаюцца грамадзкім харчаваньнем, павінен падвоіцца. Усе школьнікі і дзеці дашкольных устаноў павінны быць ахоплены гарачымі сьнеданьнямі. Востра паўстае праблема кадраў для грамадзкага харчаваньня.

Жонкі рабочых, ваш пралетарскі абавязак **папоўніць нехапаючыя кадры,** падрыхтаваўшыся для гэтага праз адпаведныя курсы.

За актыўны ўдзел у поўным і хутчэйшым выкананьні дырэктыў ЦК УсеКП(б) аб паляпшэньні справы грамадзкага харчаваньня.

Ажыццяўленьне санмінімуму—барацьба за прамфінплян

Работніцы, жонкі рабочых—у першыя рады барацьбітоў за санмінімум

Завастрэньне ўвагі на палепшаньні санітарна-бытавых умоў працоўных—важнейшая задача, якую высоўвае ў сучасны момант перад усімі арганізацыямі камуністычная партыя. Гэта зусім выразна вызначана ў прамове тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, гэта набывае зараз вялізнае значэньне ў выкананьні прамфінпляну.

Захаваньне элемэнтарных санітарных запатрабаваньняў, **чыстата ў цэху, сталоўцы, інтэрнатах, кватэрах—зарука захаваньня здароўя рабочай сілы**, ліквідацыі такога становішча, калі варштаты, машыны застаюцца на некаторы час без гаспадара, а ў больніцах і амбуляторыях ляжаць хворыя.

Магутнай зброяй у паказаным выпадку зьяўляецца санмінімум—гэта значыць цэлы рад прасьцейшых санітарна-аздараўляючых мерапрымстваў на заводзе, фабрыцы, у сталоўцы, у быце рабочага: вэнтыляцыя, барацьба з вільгацьцю, штодзенная ўборка памяшканьня ад пылу і бруду; барацьба з казюлькамі ў хаце і вопратцы, наведваньне лазьні, чыстае мыцьцё рук, чыстка зубоў, карыстаньне гатаванай вадой і г. д., якія ўскладаюць адпаведныя абавязкі як на гаспадарніка, так і на самых рабочых і работніц.

Абсьледваньне раду фабрык, заводаў, жактаў, сталовак—выявілі недапушчальна-злачынныя адносіны да выкананьня дырэктывы партыі і пастановы СНК у сэнсе правядзеньня ў жыцьцё санмінімуму.

Вялікую ролю ў правядзеньні санмінімуму адыгрывае грамадзкасьць, удзел у гэтай справе саміх работніц, калгасьніц, жонак работніц і ўсіх працоўных жанчын, што на сёняшні дзень яшчэ не адчуваецца ў належнай ступені.

Патрабуючы ад гаспадарнікаў выкананьня тых санітарных мерапрыемстваў, якія ад іх залежаць, неабходна шырока прыцягнуць работніц да ўдзелу ў ажыцьцяўленьні санмінімуму. Неабходна кожнаму рабочаму і работніцы сачыць самому за захаваньнем санітарных умоў як у быце, гэтак і на прадпрыемстве, быць правадніком санмінімуму на працы і ў сябе ў хаце, у сталоўцы. Толькі ў такіх умовах мы здолеем ажыцьцявіць дырэктыву партыі і ўраду і з посьпехам выканаем тыя заданьні, якія дыктуе нам 3-ці рашаючы год пяцігодкі.

Н. Г.

Захапляемся будаўніцтвам БССР

(Ліст з польскай турмы)

На паперы ня выкажаш, родныя, нашага захапленьня магутным будаўніцтвам БССР.

Гэтымі днямі адна таварышка атрымала адкрытку са здымкам галоўнага ўваходу Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту. Як усе мы насіліся з гэтай адкрыткай, як цешыліся, прыглядаліся. Як шкадавалі мы, што ня відаць другога боку гмаху, што нельга зазірнуць у сярэдзіну, пабачыць і пагутарыць са студэнтамі, якія прышлі ва універсытэт з заводаў і калгасаў.

— Гэта Беларусь ці Амэрыка,— дзівіліся мы. І адказвалі самі:

— Гэта БССР.

З захапленьнем мы гутарым пра будаўніцтва СССР. Хочацца ведаць пра ўсё; пра ўраджай, фабрыкі, кіно, школы, пра вашу працу. У лістох вашых мы адчуваем вялікую радасьць перамогі.

Як надзвычайна добра! Ці можна-ж сумаваць тут, у турме, калі ў Савецкім Саюзе пераможна будуецца сацыялізм!

І з заплюшчанымі і з шырока адкрытымі вачыма мы бачым новую Беларусь—Савецкую Беларусь. Мы чуем гукі ніколі нябачанага намі жыцьця. Творчая воля мільёнаў стварыла шырокія „ўсіхнія“ палі, яна выслала на гэтыя палі калёны трактараў. На гнілым балоце яна пабудавала магутныя электрастанцыі. Творчая энэргія мільёнаў працоўных зграбла тое, што стагодзьдзямі стрымлівала бег жыцьця і прывяла бег жыцьця ў хуткасьць тысячу раз большую.

У глухіх, раней закінутых, вёсках БССР пабудаваны кіно, радыё, сямігодкі, каапэрацыйныя аб'яднаньні. Ранейшыя парабкі сталі зараз на чале, яны кіраўнікі гэтага адважнага разгону жыцьця. Гэта новае жыцьцё вы ствараеце самі, вы рухаеце яго сваімі рукамі.

Тут, у турме, **нам давялося перажыць многа пакуты. Але волі нашай ніхто ня ў сілах зламаць. З усёю сілаю, сашчапіўшы зубы, мы рвемся ў клясавыя баі. З усёю сілаю любасьці братэрскай мы рвемся ня толькі ў БССР, але і да работы ў Заходняй Беларусі, на падмогу мільёнам працоўных, якія гераічна змагаюцца за сваё вызваленьне.**

Зараз нас кінулі ў турмы. Мінула ўжо многа часу. Засталося мала, зусім мала. Хутка разам з вамі мы будзем будаваць гісторыю.

Ваша В.

Новапабудаваны дом для рабочых у Гомелі.

Капіталізм у агоніі, расьце рэвалюцыйная хваля

(*Міжнародны агляд*)

Апошнія дні вельмі багатыя здарэньнямі выключнай палітычнай важнасьці. Увесь капіталістычны сьвет шпарка і няўхільна набліжаецца да катастрофы. Гаспадарчы развал паглыбляецца і пашыраецца з надзвычайнай хуткасьцю, захапляе галіны прамысловасьці, руйнуе, зьнішчае сельскую гаспадарку. Рэвалюцыйная хваля ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй, клясавая барацьба абвастраецца, набывае больш баявыя, больш рашучыя формы.

Нямеччыне—увага ўсяго сьвету. Гаспадарча-фінансавая катастрофа настолькі ярка выявілася, што нават, паводле прызнаньня буржуазных палітыкаў і буржуазнага друку, „Нямеччына знаходзіцца на краю пагібелі". У чым гэта пагібель? А пагібель у тым, што пралетарыят і працоўныя масы Нямеччыны, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ідуць на штурм, на зьнішчэньне буржуазнай дыктатуры, на зьнішчэньне нявольніцкіх путаў плянаў Юнга.

Нямецкая буржуазія вельмі старанна ўзялася праводзіць прыдушэньне камуністычнай партыі пры дапамозе сацыял-фашыстаў—гэтых крывавых сабак, лёкаеў буржуазіі—9-га жніўня наладзіла крывавую расправу. 9-га жніўня адбывалася галасаваньне аб роспуску прускага парляманту. Камуністычная партыя Нямеччыны мабілізавала працоўныя масы пад лёзунгам.—„Прэч фашыцкую дыктатуру Брунінга, прэч апору фашызму сацыял-фашысцкі ўрад Прусіі Браўна". Галасаваньне адбывалася ва ўмовах стану аблогі аднак, ня гледзячы на зьверскі тэрор, кампартыя атрымала вялізарнейшую бліскучую перамогу. 10 мільёнаў галасоў было падана за роспуск сойму з 26 мільёнаў, якія мелі права голасу. 10 мільёнаў актыўных барацьбітоў за рэвалюцыйны выхад з крызісу толькі ў аднэй Прусіі. Гэта сапраўды вялізарная перамога гістарычнай важнасьці.

Буржуазія добра сябе ўяўляе, што расправіцца з такой сілай, як камуністычная партыя Нямеччыны, вельмі цяжка. Але яна ставіць задачай загнаць кампартыю ў падпольле, разьбіць, арыштаваць партыйны апарат кампартыі. Сацыял-фашысты запэўняюць, што варта толькі разагнаць, прыдушыць кампартыю і „залаты дождж" (замежная пазыка) пойдзе сам сабой.

Бурныя баявыя выступленьні пралетарыяту і працоўных мас адбыліся і ў фашыцкай Польшчы. Забастовачная хваля ахапіла ўсе найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры, як Дамброва, Варшаву, Лодзь, Беласток і інш., а таксама перакінулася і на вёску. Бастуюць ня толькі рабочыя дрэваапрацоўчай прамысловасьці і рамесьнікі, але ў радзе ваяводзтваў бастуюць і парабкі. Гэтыя забастоўкі маюць тым большае значэньне, што кіраўніцтва забастовачным рухам, бадай, поўнасьцю ў руках камуністычнай партыі. Сацыял-фашысты, ППС, НПР, і іншыя з кожным днём трацяць свой уплыў на рабочыя масы, з кожным днём сотні і тысячы лепшых пралетараў парываюць з сацыял-фашызмам і ўліваюцца ў рады камуністычнай партыі, у рады барацьбітоў за савецкую Польшчу.

Лютая, жорсткая расправа фашыцкага ўраду і сацыял-фашыстаў над рабочымі ў апошнія часы набыла нябачаныя разьмеры, дзікія формы фізычнага зьнішчэньня лепшых адданейшых барацьбітоў за справу рабочае клясы. Расстрэлы рабочых дэманстрацый, карныя экспэдыцыі на Заходняй Беларусі і на Заходняй Украіне, фізычнае зьнішчэньне, павольнае забойства палітзьняволеных, прыраўнаньне іх у правох да крымінальных уведзена ў сыстэму панаваньня фашыцкай дыктатуры. Аднак, па меры ўзмацненьня тэрору яшчэ больш абвастраюцца клясавыя баі і пралетарыят і працоўныя масы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на ўдар адказваюць ударам.

Забастовачны рух шырока ахапіў рад важнейшых галін прамысловасьці і ў Францыі, у Англіі, у ПАЗШ, Італіі і іншых буржуазных краінах. Зруйнаваныя, даведзеныя да жабрацтва рабочая кляса і працоўнае сялянства, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, адбіваюць атакі наступленьня капіталу і пераходзяць самі ў контр-атаку. Рэвалюцыйнае полымя разгараецца ва ўсім сьвеце. Сьцяг пралетарскай рэвалюцыі ўзьнімаецца ўсё вышэй і вышэй.

У той час, як увесь капіталістычны сьвет хуткімі тэмпамі ідзе да катастрофы, у Савецкім Саюзе—бацькаўшчыне ўсіх працоўных, нябачанымі тэмпамі рабочая кляса, калгасьнікі і ўсе працоўныя, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у трэцім рашаючым годзе пасьпяхова **завяршаюць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі.** Уступаюць у строй новыя гіганты-заводы, новыя фабрыкі. Пуск 518 і 1040 забясьпечаны.

Работніцы, у адказ на фашыцкі крывавы тэрор у Польшчы арганізуйце новыя ўдарныя брыгады, дабецеся поўнай ліквідацыі прарываў.

Калгасьніцы і працоўныя сялянкі, адкажэце на фашыцкі тэрор яшчэ больш ударнай працай па ўборцы ўраджаю, арганізацыяй чырвоных абозаў.

Працоўныя жанчыны, арганізуйце праз МОПР шырокую дапамогу палітзьняволеным.

За поўнае выкананьне плянаў загатовак

Загатоўчая кампанія праходзіць яшчэ зусім не здавальняюча. На 10 жніўня загатоўлена: збожжа—13,6 проц. жнівеньскага пляну, сена—17,9 проц. гадавога пляну, раньняй бульбы—28,4 проц.

Такое становішча з загатоўкамі тлумачыцца дрэннай працай загатоўчага апарату і партыйных арганізацый, якія замест разгорнутай масавай работы па арганізацыі загатовак узялі стаўку на **самацёк.**

Загатоўчы апарат у радзе выпадкаў дэзарганізуе работу, адмаўляючыся ад прыёму прадукцыі з прычыны сваёй непадрыхтаванасьці (Гарадок, Віцебск—сена, Менск—пло дагародніна).

За зборам тары для загатовак.

Апартуністычная стаўка на самацёк павінна атрымаць рашучы адпор. Неабходна тэрмінова ўзяцца за **арганізацыю загатовак,** мабілізаваўшы на гэта ўвесь вясковы актыў.

Загатоўчая кампанія павінна быць праведзіна **тэрмінова.** Трэба дабіцца **„здачы збожжа з пад малатарні на загатоўчыя пункты".**

Загатоўчы апарат павінен дабіцца поўнага зьнішчэньня чаргі пры здачы прадуктаў.

ЦК КП(б)Б адзначае, „што **праяўленьне** бязь **дзейнасьці і непаваротлівасьці, казённафармальных адносін да здатчыкаў прадукцыі,** а таксама **ўсякія жаданьні адкласьці абмалот і здачу** збожжа да **марозаў—будуць разглядацца, як праяўленьні кулацкага ўплыву".**

Пляны загатовак рэальныя, аб гэтым сьведчыць перавыкананьне іх радам раёнаў (Чырвона-Слабодзкі, Бягомльскі і інш.).

Рабселькоркі - дэлегаткі павінны пад кіраўніцтвам партячэек быць **ініцыятарамі сацспаборніцтва** паміж калгасамі, саўгасамі, вёскамі, сельсаветамі і раёнамі па лепшым і хутчэйшым правядзеньні загатоўчай кампаніі. Рабселькоркі і дэлегаткі павінны быць арганізатарамі **чырвоных абозаў.**

Калгасы павінны паказаць прыклад больш высокіх тэмпаў у выкананьні загатоўчых плянаў.

Нельга недаацэньваць і ролі аднаасобнікаў у загатоўчай кампаніі гэтага году. „Неабходна дабіцца здачы прадукцыі індывідуальным сэктарам з тым, каб з гектара пасеву аднаасобнікі здалі-б ня менш чым калгасьнікі".

Рэалізацыя кантрактацыйных дагавораў павінна аказаць значную дапамогу пасьпяховаму выкананьню пляну загатовак.

Аднак, на 15 жніўня рэалізавана толькі 3 проц. пляну кантрактацыйных плянаў па збожжы. Пляны кантрактацыі павінны быць поўнасьцю і хутчэй выкананы.

Рабселькоркі і дэлегаткі павінны дабівацца гэтага асабістым прыкладам і арганізацыяй масы працоўных жанчын вёскі на выкананьне плянаў.

Спэцыялізацыя нашай сельскай гаспадаркі ставіць на першае месца загатоўку **тэхкультур, плодагародніны і прадуктаў жывелагадоўлі.**

Таму неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на падрыхтоўку да гэтых відаў загатовак.

У арганізацыі загатовак гародніны на зіму асаблівую актыўнасьць і ініцыятыву павінны праявіць жанчыны.

Працоўныя жанчыны павінны таксама **шырока арганізаваць збор тары для загатовак.**

Па-ўдарнаму, па-баявому мабілізуемся на выкананьне адказьнейшых задач сучаснага пэрыяду. Дамо жорсткі адпор клясаваму ворагу, які будзе старацца нам перашкодзіць. Ударым па апартуністых, якія спадяюцца на самацёк.

Клім Грыневіч.

Жанчына - трактарыст

З русымі касамі,
загарэлая,
з тварам палкім
яркае зары...
І завуць яе
адважна-сьмелаю:
трак-та-рыст...
Чуць зара заблытае
ў чырвань
малады,
аквечаны ўсход,
дыму чорнага,
спусьціўшы грыву
трактар пойдзе
ў паход.
... І палягуць скібы
стройна,
пышна,
разаб'ецца ў пух
аблогі крэп.
І ўзрасьце—
авёс, ці
мо грачыха,
ураджаем добрым
шабарэць...
З русымі касамі,
загарэлая,
з тварам палкім
яркае зары...
І завуць яе ў калгасе
сьмелаю:
— Трак-та-рыст...

Менск, 1931 г.

Героі Уборачнай

... Пасеяна 70 *га*. Плян выканан на 230 проц.

Яны ўзялі пяршынства ў раёне па выкананьні і перавыкананьні пляну тэхнічных культур. Лён парос у пояс чалавека. Пасевы былі дагледжаны.

— Вось дзе сырэц для новых фабрык тэкстыльнай прамысловасьці,—гавораць з гонарам калгасьнікі.

Ёсьць чым ганарыцца!

***

Усе 70 *га* чакаюць уборкі. Лён жоўкне. Трэба ў пару сабраць. Ні каліва не пакінуць на полі. Па-бальшавіцку ўбраць—баявая задача кожнага калгасьніка.

На лён вышлі ўсе. Дома—ніводнай жанчыны. Разьбіліся на брыгады. Старыя жанчыны асобна, падросткі асобна, малыя дзяўчаты організавалі сваю брыгаду. Кожнай брыгадзе—вучастак. І—хто каго апярэдзіць. Хто больш!

І закіпела работа. За брыгадамі церабільніц усьлед брыгада хлапцоў падбірае і складае снапы. Сонца на поўдні. Паліць бязьлітасна, аж крышацца галоўкі. Шкода дабра. Золата—насеньне гіне задарма.

Паходная кухня прывезла на поле абед. Перапынак. Брыгады расьселіся абедаць. Распачалі гутарку. У галаве адно—лён. Як захаваць, каб не псаваўся?

— Хіба ўночы ўбіраць. Ня будуць так крышыцца галоўкі—унесла прапанову Мельнікава Хрысьціна.

— А што вы думаеце. Давайце папрабуем—падхапіла Марчанка Маша.

Пасьля работы дагледзім каля хаты і выйдзем,—загаманілі дзяўчыны.

Перапынак скончыўся. Папалуднавалі. І зноў за працу. На выперадкі да вечара...

***

Сонца спусьцілася за небасхілам. Халодны змрок ночы ахінуў зямлю. Табэльшчык падлічыў выпрацоўку. Брыгада Мельнікавай Хрысьціны выцерабіла 3 з паловай капы на жанчыну, брыгада Жгіроўскай Каці — па 3 капы і 20 снапоў...

Норму перавыканалі. Нават брыгада малых дзяўчат і тая выцерабіла па 110 снапоў на кожную.

Брыгады шумліва варочаліся дамоў. У галовах адно — лён. Выйсьці ўночы рваць лён. Абмяркоўвалі, як лепш і хутчэй справіцца.

Кабеты не разыходзіліся па хатах. — Пойдзем дагаварыцца з праўленьнем, што яно думае...—камандуе Усьціловіч Параска.

— Пойдзем, — адказалі ўсе ў адзін голас.

***

Кантора калгасу, як і кожны дзень пасьля работы, бітком набіта калгасьнікамі. Падлічваюць, запісваюць у кніжкі.

— Паглядзі, браце, бабскае войска валіць з ільну,—жартліва заўважыў малады хлапец Янка, ўбачыўшы праз вакно дзесяткі жанчын, якія проста ў кантору валяць.

— Дзе старшыня? Дзе Караленка? Дзе Косьцік?—пыталі жанчыны ў канторы.

— На што ён вам, даражэнькія—пачаў завіхацца ля жанчын калгасны гумарыст Прывалаў Ціт.

— Жартаваць няма калі. Сёньня пойдзем уночы рваць лён,—пачала Мельнікава Хрысьціна.

Мужчыны паднялі сьмех:

— Ого, работніцы! Дзень вам малы жартавалі мужчыны наконт гэтай прапановы.

Усьцішыўшы агульную гаворку, пачаў Караленка:

— Давайце прымем прапанову жанчыны. Але, я думаю, выйсьці ўночы не адным жанчынам, а ўсім—і мужчынам.

— А што думаеш, спужаліся?—адказаў дзядзька Манькоў Іван.

Гутарылі доўга. Нават даходзіла да спрэчак. Але ў канцы дагаварыліся выйсьці ўсім на лён.

Гэта ноч была нязвычайная ноч. Пачыналі нешта новае, цікавае. Хлапцы жартавалі:

— Сёньня ўсяночная, пойдзем сьвянціць лён...

У напружанай, заядлай працы, з песьняй няпрыкметна прайшла ноч. Раніцой, як толькі пачала распаўзацца цемень ночы, людзі ўбачылі перамогу. 20 гектараў ільну скацілі, як кажуць, у трубу. 20 гектараў як вол зьлізаў.

Такіх было 4 ночы — 4 ночы на ільняным калгасным полі кіпела работа, 4 дні, якія прынесьлі рашаючую перамогу. 70 гектараў убрана.

Сваячасова скончыць уборку для калгасьнікаў—справа гонару, справа геройства".

П. Зубровіч.

Рэчыцкі раён. Калгас імя Калініна.



Палітэхнізацыя школы. Вучні за ворывам (польскі нацыянальны сельсавет імя Ланцуцкага, Копыльскага раёну).

Увага баявому зьвяну бальшавіцкага друку

Рэдакцыя „Беларускай работніцы і сялянкі“ накіравала свайго прадстаўніка ў Асьвейскі раён з такім даручэньнем: да ільняўборкі арганізаваць у калгасах палявыя газэты, прыцягнуць да гэтай справы калгасьніц.

Каб стварыць палявыя газэты ў некалькіх калгасах, разам з РК партыі і рэдакцыяй раённай газэты мабілізавана некалькі партыйцаў і камсамольцаў.

Пачалі з рэйду. Стварылі 2 брыгады, праверылі гатоўнасьць да ільнаўборкі 4-х раённых арганізацый: райза, каапільнасаюзу, калгассаюзу, МТС. Рэйд выкрыў, што **арганізацыі да ўборкі не падрыхтаваны, яны апартуністычна недаацэньваюць ручную ільнаўборку.** Матар'ялы рэйду пераслалі ў раённую газэту, у „Бел. раб. і сялянку“ і ў „Зьвязду“.

Арганізатараў палявых газэт накіравалі ў калгасы: „Карла Маркса“, „Колас-Калініна“, „Авангард“ і „Новы шлях“. У большасьці гэтых калгасаў насьценгазэт дагэтуль не існавала. Таму ня толькі палявая газэта, а наогул калгасны друк зьявіўся вялікаю навіною. У некаторых калгасах мэту палявой газэты загадзя абгаварылі на сходах. Стварылі рэдкалегію.

Газэта выхадзіла штодня. Яе зьмяшчалі там, дзе ў гэты дзень больш працуе людзей: каля жнявяркі, каля малатарні, на таку побач з вывешанымі нарадамі і г. д.

Як мы вербавалі актыў

Першыя дні ніхто не даваў матар'ялаў у газэту. Членаў рэдкалегіі мы прымацавалі да асноўных галін гаспадаркі. З гутарак з брыгадзірамі і ўдарнікамі члены рэдкалегіі знаходзілі матар'ял для газэты. Былі выпадкі, калі некаторыя калгасьнікі і нават брыгадзіры адмаўляліся даць факты члену рэдкалегіі: „Калі ў газэтку, нічога не скажу табе“.

З выхадам першых нумароў „байкот“ быў зломан. Цэлымі пачкамі стаў паступаць матар'ял у газэту. Па адным, нават групамі зьяўляліся да рэдкалегіі калгасьнікі, прасілі „працягнуць“ віната. У калгасе „Карла Маркса“ досьвіткам у рэдкалегію зьявілася цэлая дэлегацыя пастухоў са скаргай на прагульшчыцу — дачку Штэйн. За выключэньнем асобных выпадкаў паданыя факты адпавядалі сапраўднасьці.

Аб чым пісалі ў палявую газэту

Зьмест пераважнай большасьці допісаў—здаровая крытыка недахопаў у паасобных галінах гаспадаркі. У „Новым шляху“ селькоры адзначалі, што працуючыя на касілцы позна выходзяць на работу і дрэнна адносяцца да машын. У калгасе „Карла Маркса“ выкрылі, што ў калгасным млыне адбываюцца папойкі, якія прыводзяць да псаваньня рухавіка. За „магарыч“ мельнік выслугоўваецца перад аднаасобнікамі. Жыта з млыну пападае на прыватны рынак. У гэтым самым калгасе селькоры рабілі заўвагу пра тое, што пара на сіласную яму падсыпаць зямлі, бо сілас асядае, зьверху ямы ствараецца яма, якая заплывае вадою, і ад гэтага можа папсавацца сілас і г. д.

У пераважнай большасьці матар'ялаў зазначаліся недахопы і ўносіліся прапановы, як палепшыць работу. Гэта даводзіць здаровае імкненьне калгасьнікаў праз газэту выносіць недахопы пад абстрэл грамадзкасьці.

Былі і нездаровыя імкненьні. Былі спробы выкарыстаць палявую газэту з тым, каб сваю віну пераваліць на невінаватага.

Калёсьнік Сяргей зьявіўся да члена рэдкалегіі ўсхваляваны.

— Вось бачыце, мяне прымусілі прагуляць больш за тры гадзіны.

— Як прымусілі, хто?—запыталі мы.

— Марачкоўскі—загадчык інвэнтаром — не зьявіўся на работу. Мне трэба хамут, а хамут пад замком. І Марачкоўскі невядома дзе. Працягнуць яго трэба ў газэце, каб не прымушаў людзей прагульваць.

Рэдкалегія крытычна падышла да заявы Сяргея. Мы праверылі факт і даведаліся, што вінават сам Сяргей. Ён зьявіўся на працу тады, калі Марачкоўскі даўно ўжо выдаў усім інвэнтар і сам пашоў касіць. Калесьніка за прагул пасадзілі на чорную дошку. Ня ведаў ён, што рэдкалегія знайшла сапраўды вінаватага ў прагуле яго — Сяргея. Таму на заўтра Калесьнік зноў соладка заспаў. Але хутка адшукаў яго бацька, і Сяргей зьдзіўлена пачуў скрозь лаянку такія папрокі старога.

— Уставай ты, гуляка. Зноў сьпіш. Усе людзі даўно на працу пашлі. Зноў у газэтку пападзеш. Паглядзі, як там цябе размалявалі сёньня.

Схапіўшыся, Сяргей пабег хутчэй да газэты. Мабыць, пасьля гэтага ён ня будзе больш прасыпаць працу.

Другое адмоўнае—спроба засыпаць газэту бытавымі драбніцамі, якія ня маюць ніякай грамадзкай каштоўнасьці (узаемаадносіны хлапца з дзяўчынай і г. д.).

Рэдкалегія насьценгазэты калгасу імя Крупскай Менскага раё-у.

Трэба забясьпечыць парткіраўніцтва газэтай. У склад рэдкалегіі трэба падбіраць вытрыманых калгасьніц і калгасьнікаў. Трэба стварыць рэдкалегію, якая-б адмяла спробу клясавага ворага і прагульшчыка выкарыстаць газэту ў сваіх інтарэсах. Неабходна забясьпечыць выкананьне газэтай сваёй адказнай палітычнай ролі. Палявая газэта ні ў якім разе не павінна запаўняцца драбніцамі. Яна змагаецца за прынцыповыя пытаньні, якія маюць грамадзкае значэньне.

Як рэагавалі на допісы ў газэце

Некаторыя допісы палявой газэты пераданы на расьсьледваньне ў вышэйшыя арганізацыі.

Кожны факт, ці імя, памянёнае ў газэце, куляй аблятала ўвесь калгас. **На кожны допіс адразу-ж рэагавалі.** Як правіла, на крытыку адказвалі здаровым рэагаваньнем. Паводле прапановы газэты ў той самы дзень прыводзіліся ў парадак сельскагаспадарчыя машыны, адстаючая брыгада раўнялася па ўдарнай.

У калгасе „Карла Маркса" кульгала справаздачнасьць ясьляй перад бацькамі і мэдыцынскі нагляд за ясьлямі. Па прапанове газэты, загадчыца ясьлямі рыхтуе справаздачу на першы жаночы сход, умаўляецца з доктарам аб наглядзе за дзяцьмі і аб лекцыі маткам. Скарачаюцца прагулы, узрастае продукцыйнасьць працы.

Але побач з гэтым кулацкія агенты, рвачы, прагульшчыкі, п'яніцы з чорнага сьпісу палявой газэты пачалі групавацца. З боку іх быў вялікі націск на рэдкалегію, каб выведаць імя селькора. Працаўнікі рэдкалегі чулі ад іх нават такія пагрозы: „Таго, хто піша ў газэту, трэба з-за вугла цаглінаю пачаставаць, каб не баламуціў людзей".

У калгасе „Карла Маркса" быў выпадак, калі пакрыўджаныя" газэтай нацкававалі на члена рэдкалегіі брыгаду калгасьніц з патрабаваньнем: „Прыкрыйце газэту" (тая-ж брыгада пад вечар зразумела і прызнала сваю памылку, прышоўшы ў канцылярыю газэты). Прагульшчыкі і зрыўшчыкі зьдзельшчыны казалі: „Выкажы на словах, што хочаш, але ў газэту ня пішы".

Усё гэта яшчэ раз сьведчыць, што палявая газэта, як частка ўсяго нашага друку,—вастрэйшая зброя партыі. Палявая газэта найбольш балюча ўдарыла па кулацкім агенту, прагульшчыку, рвачу, зрыўшыку мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Таму гэта зграя пачала групавацца, каб пагрозамі, цкаваньнем перашкодзіць у рабоце газэты.

Аднак, асноўная маса калгасьнікаў гэтай зграі дала руйнуючы бой. Некаторыя брыгады адмовіліся прымаць у свой склад гультаёў. Ад груп п'яніц, якія папалі ў чорны сьпіс, адышла значная частка лепшых калгасьнікаў, парвала з п'яніцамі ўсякае сяброўства.

З кожным днём у рэдкалегіі ўзрастала колькасьць паступіўшых матар'ялаў. Паступіў рад прапаноў, каб газэта выходзіла ня толькі ў часе ўборачнай, а засталася пастаяннай. Рэдкалегіі паклапаціліся набыць макеты, на якіх выходзяць палёўкі. Усе рэдкалегіі ўзяліся выпускаць газэту надалей,

Калгас імя Крупскай. Ударн'цы на жніве.

з тым, каб, скончыўшы ўборачную, ператварыць яе ў апэрацыйную насьценгазэту калгасу (яна будзе выходзіць раз у 3—5 дзён).

Чаго дабілася газэта

Бязьлітасна б'ючы падрыўшчыка работы, палявая газэта з самага пачатку паказала прыклады ўдарнай работы брыгад і асобных ударнікаў.

У калгасе „Карла Маркса" пад ільном 136 *га*. Кулацкія агенты, каб сарваць ільнаўборку, агітуюць супроць выхаду на поле жанчын, супроць бальшавіцкіх тэмпаў уборкі. Трэба было зламаць гэта супраціўленьне. Паказаўшы вынікі ўдарнай працы, газэта дае лёзунг: **Ні каліва ільну—на полі.** Сацспаборніцтвам брыгад забясьпечым перамогу ў ільнаўборцы". Газэта папулярызуе пастановы вытворчай нарады па гэтым пытаньні.

Каб забясьпечыць посьпех ільнаўборкі, неабходна мабілізаваць на гэту справу ўвагу ўсёй масы калгасьнікаў. Таму, умовіўшыся з партячэйкай мы ставім пытаньне аб ільнаўборцы на агульным сходзе ўсяго калгасу (калгас яднае 175 гаспадарак). На гэтым сходзе калгас „Карла Маркса" абвяшчае сабе ўдарным у ільнаўборцы і выклікае на сацспаборніцтва суседні буйны калгас „Колас Калініна". Калгасьнікі зьвярнуліся з заклікам да ўсіх калгасьнікаў БССР у раёнах, дзе будуюцца ільназаводы, каб коньмі і людзьмі дапамаглі скараціць тэрмін будаўніцтва.

Вопыт палявых газэт трэба пашырыць. Палявыя газэты—баявое зьвяно бальшавіцкага друку. Яны гуртуюць вакол сябе актыў калгасьнікаў—лепшых ударнікаў. Даючы адпор кулаку і яго агенту—апартуністу, палявыя газэты арганізуюць масы для перамог у сацыялістычнай будоўлі.

Калгасьніцы, саўгасьніцы, пад кіраўніцтвам парт'ячэек будуйце палявыя газэты!

В. Хмялеўская.

Падцягнем адсталы вучастак у распаўсюджваньні пазыкі—індывідуальны сэктар

Рэалізавалі пазыку на 30.000 руб.

У часе месячніка генэральнай праверкі ўборачнай кампаніі па Крупскім раёне арганізавалася шмат новых калгасаў. У старыя калгасы ўлілося больш 150 новых гаспадарак, вычышчана 20 клясава-чужых гаспадарак.

Уведзена зьдзельшчына на 85 проц. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена 75 проц. калгасьнікаў.

Рэалізавана пазыкі „3-ці рашаючы" за наяўны разрахунак на 30.000 руб.

Лепшыя ўдарнікі ўборачнай прэміяваны на 500 руб.

Літвінава Ларыса.

Крупскій раён.

Зося Салавей.

Па пачыне Салавей Зосі

Па пачыне лепшай ударніцы нашага калгасу **Салавей Зосі** ўсе калгасьнікі ўхвалілі падпісацца на пазыку „3-ці рашаючы" на 30-цідзенны заработак. Сама-ж тав. Салавей падпісалася на 40 р.

Калгасьніцы-ўдарніцы, бярэце прыклад з тав. Салавей Зосі.

Алесь Шпакоўскі.

Калгас „Чырвоная зорка".

Жаночыя брыгады распаўсюдзілі пазыку

У Людзяневіцкім сельсавеце па ініцыятыве райжанарганізатара арганізавалі жаночыя брыгады, якія завербавалі падпісчыкаў на пазыку „3-ці рашаючы" за **адзін дзень на 115 руб.**

Партячэйка на працу сярод жанчын глядзіць скрозь пальцы, ня гледзячы на тое, што ёсьць жанарганізатар. Неабходна партячэйцы зараз-жа зьнішчыць такія адносіны да жанпрацы. **Л М.**

Хатнія гаспадыні за пераход на вытворчую працу

Арганізавана прышлі жонкі рабочых гор. Менску на сваю канфэрэнцыю. Прышлі з лёзунгамі і музыкай да дому Камасьветы. Асаблівай арганізаванасьцю выдзяляўся Жакт № 12.

У 8 гадзін заля была перапоўнена.

Уважліва заслухалі даклад аб задачах уцягненьня хатніх гаспадынь у вытворчую працу і аб санмінімуме.

Па дакладах разгарнуліся гарачыя спрэчкі! Выступаўшыя віталі пастановы партыі і ўраду аб максымальным уцягненьні працоўных жанчын у прамысловасьць, віталі заключэньне дагавароў паміж гаспадарнікамі і жактамі, у якіх жакты абавязваюцца даць прадпрыемствам рабочую сілу з існуючых у іх рэзэрваў, а гаспадарнікі павінны арганізаваць іх кваліфікацыю. Жакты і гаспад арнікі бяруць сябе ўзаемныя абавязацельствы аб арганізацыі бытавых устаноў.

Хатнія гаспадыні патрабавалі ад жактаў арганізацыі іх бытавога абслугоўваньня і вызваленьня іх для вытворчай працы.

Адзначалі таксама антысанітарнае становішча раду дамоў жактаў. Часта з-за таго, што сваячасова ня робіцца дробны рамонт, псуюцца каштоўныя дамы.

На дварох жактаў валяецца сьмецьце, ад якога заражаецца паветра. Бруд—частае зьявішча ў жактаўскіх дамох.

Удзельніцы канфэрэнцыі заклікалі ўсіх хатніх гаспадынь трымаць свае кватэры, калідоры і кухні ў чыстаце, каб пазбавіцца ад сырасьці, бруду і гнілі ў кватэрах, што адбіваецца на здароўі рабочых і на выкананьні прамфінпляну. Актыўна прайшла канфэрэнцыя. Жонкі рабочых выявілі сваю гатоўнасьць папоўніць кадры для прамысловасьці, якіх не хапае.

Удзельніца.

Мякка-шакалядны цэх новай фабрыкі „Камунарка".

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ЧАСОПІС „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА".

Прэміяваць ударнікаў жывёлагадоўлі

Чырвоны куток паўнюткі народу. Чуецца ўзбуджаная гутарка, вясёлы сьмех. Старшыня адкрывае сход.

Галоўнае пытаньне: „Адозва СНК аб жывёлагадоўлі".

— Трэба знайсьці канкрэтнае прыстасаваньне адозвы ў нас— кажа брыгадзір-ударнік т. **Вайцахоўскі.**

Ажывіўся сход, загаварыў. Пытаньне жывёлагадоўлі надта цікавіць калгасьніц і калгасьнікаў.

Перадавы калгас раёну імя Тэльмана першым скончыў уборку 150 *га* жыта, 117 *га* сена, 69 *га* аўса. 100 *га* другога ўкосу завуць касцоў і касілкі да працы

У калгасе зараз усяго 20 сьвіней. „Трэба ўкамплектаваць сьвіное стада да 100 штук"—турбуе думка кожнага калгасьніка. Будуецца сьвінарнік.

— Няма цьвікоў, цэглы. Нылі некаторыя—ня скончым будоўлю сьвінарніка, але сход даў рашучы адпор ныцікам.

— Абавязкова скончым пабудову да 4-га верасьня, дарма, што няма цьвікоў. Абору пабудавалі драўлянымі цьвікамі і дротам і сьвінарнік на 100 штук пабудуем — горача выказваецца лепшы ўдарнік будаўніцтва брыгадзір Лычкоўскі.—І яшчэ я прапаную пабудаваць да 4-га верасьня парнік.

Дружна падхапіў сход прапанову Лычкоўскага.

— Пабудаваць, абавязкова пабудуем—адказаў сход на кулацкія матывы.

У каго больш за тры сьвіньні— абагуліць,—прапанавала батрачка **Грыцкевіч Валя.**

Нікога супроць. **Пабудаваць сьвінарнік і парнік, абагуліць сьвіней.**

Кармовыя балянсы ня менш важнае пытаньне — кажа старшыня сходу. Паводле пляну засіласаваць 15 тон.

— Мала — адказвае Дзядзюля Раман—старшыня калгасу.

На заўтра-ж выкапалі яму на 40 тон і пачалі сіласаваньне.

Але і гэтага мала, сход галасуе за капаньне трох траншэй па 20 тон кожная.

Плян пасеву азімага жыта— 150 *га.* Трэба больш даць дзяржаве хлеба, трэба вышукаць закінутыя землі, купіць штучнае ўгнаеньне,—кажа ўдарніца т. **Лебядзевіч.**

Ударна праходзіць малацьба і ачыстка насеньня. Лепшыя ўдарніцы — **Шугаеўская Надзя, Вайцаховіч Маня, Аніськовіч Марыля—заўсёды перавыконваюць заданьне па малацьбе.**

Падпіска на пазыку праходзіла шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. **У выніку падпісаліся на 3600 рублёў за наяўны разрахунак.**

Паказальнікі выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну

Ударніцы—даяркі жывёлагадоўчага саўгасу „Вялікія навасёлкі", Койданаўскага раёну.

— Я прапаную даць сустрэчны ў 200 *га*.

— 200 *га* — прагрымеў сход у адказ ударніцы Лебядзевіч.

Калгас першым у раёне датэрмінова выканаў 50 проц. збожжазагатовак, 664 цэнтнэры збожжа, 224 ячменю, 110 цэнтнэраў сена — першы чырвоны абоз.

ударнае сканчэньне ўборачнай і малацьбы, будаўніцтва, мабілізацыя сродкаў ставяць калгас у першыя рады змагароў за сацыялістычную жывёлагадоўлю.

Ударнік—калгас „Тэльмана"— павінен быць прэміяваны.

Куніна.

Койданаўскі раён.

Лепшых ударніц прэміявалі

Догляд сьвіней у нас быў вельмі дрэнны, з-за таго, што ленаваліся падвозіць траву. Сьвіньням замест 4-х мяшкоў давалі ўсяго адзін, у лепшым выпадку—два мяшкі. Але, **дзякуючы арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва,** у нас у сьвінарніку праца значна палепшылася. Зьнішчылі бруд, падвоз вады і корму стаў нармальным, амаль няма адыходу парасят. Ударнікі на агульным сходзе абавязаліся яшчэ больш узмацніць сацспаборніцтва і ўдарніцтва, браць на буксір адстаючых і змагацца за лепшыя паказальнікі працы.

Лепшыя ўдарнікі—**Анцыпяровіч Ганна, Анцыпяровіч Прузына і Ключнік Антося** — прэміяваны.

Русовіч, В.

Заслаўскі раён, саўгас „Беларусь".

Ударнікі

В. Хмялеўская

З канфэрэнцыі сьпяшаліся дамоў. Нават на „кіне“ не засталіся. Да васьмі гадзін трэба пасьпець дамоў на вытворчую нараду. Брыгадзіркі падганяюць дэлегацыю:

— Хоць-бы пасьпелі!

Едучы, палуднавалі калектыўна. Пакункі паразьвязвалі, хто што мае, разам елі.

Праяжджалі праз вёску—суседку. У хаце музыкі гралі. Моладзі паўнюткі двор і на вокнах паналіплі. Чаму-б не павесяліцца?!

З нашага возу саскочыў Аркадзь-трактарыст і Шыпёнак (малодшы). Сьцягнулі іх музыкі. Ганна толькі пахвалілася:

—Усё роўна, пасьля нарады пабягу сюды!

Гэтага слова яна так і ня стрымала. Можа ўплылі на яе словы другой брыгадзіркі Вульляны:

— Ноч ня спаўшы, такая потым будзе і работа.

* * *

Вытворчая нарада. Сабраліся позна. Пленум сельсавету затрымаў.

Над сталом навісьлі. Бліжэй—брыгадзіры. Аж да парога—проста зацікаўленыя.

Рэдка выбухне гарачка, калі адзін перабівае прамову другога. Пара гарачая, але нецярпліваcьць хавалі глыбока, каб ня зьбіла яна, каб ня вышла: „пасьпяшым—людзей насьмяшым“.

Меркавалі марудна пра немарудную, вельмі гарачую справу—пра ўборачную. Больш за ўсё клопатаў аб ільне. Лён патрабуе найбольш рабочых рук. Старшыня далажыў:

— Лён. Будаўніцтва. Асеньняя сяўба—усё рабочыя рукі.

Убачыў задуменнасьць, ня стрымаўся.

— Таварышы, вялікая работа нас чакае. Але ў час, калі змагаліся мы за зямлю, за саветы,—перамаглі не такія труднасьці.

— У нас ня ўсе на работу выходзяць. У Кахановіцкім аддзяленьні частка з усёй аддаванасьцю робіць. Там ёсьць бабулі, якія маладым некалькі ачкоў даюць. І там-жа ёсьць дужыя маладыя, якія дома сядзяць. Ва ўборачную мы павінны перад такімі паставіць пытаньне рубам: „Сапраўды хочаш будаваць калгас—выходзь на поле“.

Скончыў старшыня, сеў. Некалькі хвілін усе маўчалі. Моўчкі меркавалі. Пасьля па аднэй выкладалі прапановы. Кожная прапанова, што камень, адкідаць яе—ня так лёгка. І патрэбы такой няма.

З прапаноў пастанову склалі. У пастанове: усе 136 гектараў ільну падзяліць на вучасткі. За **кожным вучасткам замацаваць брыгады**: для цярабленьня ільну, а таксама для мочкі, сланьня і звозкі з поля. Выходзіць з разьліку 12 чалавек на гектар (для цярабленьня). **Між брыгадамі разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва. Лепшая брыгада атрымае прэмію ў 100 рублёў.** На час ільнаўборкі ва ўсіх вёсках будуць арганізаваны простыя дзіцячыя ясьлі. Работа нянек будзе таксама ўлічвацца ў працаднёх.

Так парашылі. Улічылі кожныя рабочыя рукі. Кожнаму вызначылі яго месца ў рабоце.

Каб пастанова вытворчай нарады была ператворана ў справу, трэба, каб яе ведаў кожны калгасьнік, калгасьніца. Таму і абвясьцілі на бліжэйшы дзень агульны сход усяго калгасу. Павінны сабрацца людзі з усіх дзесяці вёсак і пасёлкаў, аб яднаных калгасам.

* * *

Сход аб уборачнай, аб ільне. Убраць — замацаваць посьпехі вясны. Убраць — перамагчы. Убраць — новы цьвік у труну клясавага ворага. Ня ўбраць—страта. Ня ўбраць—козыр кулаку.

Так і думае кожны па-свайму. „Ні каліва на полі“ — мяркуе калгасьнік. „Сарваць уборку“—супраціўляецца кулак. „Арганізаваўшы масы—пераможам„—кажа партячэйка. „Цяжка не пад сілу“—стогне апартуніст.

Ільну першы раз засеялі так многа. Лён—працаёмістая культура. Вось чаму клясавы вораг так спадзяецца „тут сарваць“. Рыхтуючы зрыў ільнаўборкі,

Поле сушкі ільну Ліхаслаўскага ільнакамбінату.

кулак стараецца зблытаць увесь плян уборачнай.

Вось чаму Піскуніха і Краснашчокаў так разгарнулі свае пляны, складзеныя па кулацкай указцы. Намер Піскуніхі выразны: сарваць сход, сарваць сацспаборніцтва. Яна загадзя „рыхтуе масу“. Сабрала больш дзесятка жанчын, агітуе супроць калгасаў, супроць зьдзельшчыны, супроць ударнай работы.

Нутро Піскуніхі на далоні. Толькі кулацкі агент вуснамі Піскуніхі мог выказаць, што „пан быў радней за калгасы“. Дзіця ведае, што пан радня толькі клясавым ворагам працоўных. Кулацтва—адзіныя капіталістычныя парасткі, суцэльная калектывізацыя нясе канчатковую ліквідацыю кулацтва як клясы.

„Падрыхтоўка“ Піскуніхі прапала дарма. Калгасьніцы слухалі прамоўцаў. Піскуніха зноў мабілізнула ўласнае горла. Яе падвучылі крычаць, зрываць сход. Яна адшукала слабейшае месца.

— Абутку, вопраткі дайце, тады выйдзем у поле. Усе мы працавітыя—пакрывае яна гультаёў.

Калі горла Піскуніхі пачало здаваць, на падмогу прышоў Краснашчокаў. Ён супроць сацспаборніцтва, і зьдзельшчына яму ня люба.

— Мне каля 60 год, а я сама бяруся вырваць больш за гектар ільну—абяцае Саліцкая Дар'я.

Практычныя заняткі па вызначэньні якасьці ільну на курсах ільна-работнікаў пры Лядовіцкім ільназаводзе № 4.

Сход выкрыў і даў адпор кулацкім агентам. Сход ухваліў пастанову вытворчай нарады, абвясьціў калгас ударным у ільнаўборцы і выклікаў на сацспаборніцтва суседні калгас „Калініна“.

— Выклікаем, няхай яны робяць як мы, паднімаючы рукі за адозву,—кажа Куклінскі Пракоп, высокі дзед з сіваю падстрыжанаю коратка барадою.

Зьвярнуліся з адозваю да ўсіх калгасаў Беларусі, дзе будуюцца ільназаводы,—коньмі і людзьмі дапамагаць хутчэй скончыць будаўніцтва.

Піскуніха і Краснашчокаў, зганьбаваныя, выкрытыя, адышлі пад парог і змоўклі.

Вульляна і яшчэ адзін брыгадзір дасталі кавалак паперы і агрызак алоўка, запісалі тэрміны ільнаўборкі.

— Калі па-ўдарнаму — выканаем раней,—кажа Вульляна.

Ссыпка фрэзэрнага торфу ў штабеля. Торфзавод „Шлях да сацыялізму“.

Патрабуем стварыць умовы для працы работніц-матак.

Адкрыты ліст работніц-ударніц канфэрэнцыі швэйнай прамысловасьці гор. Менску

Да Менгарсавету, Гарпрафсавету і ВСНГ

Шпаркія тэмпы разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі, якія поўнасьцю ліквідавалі беспрацоўе, востра паставілі пытаньне аб рабочай сіле для прамысловасьці і іншых галін народнай гаспадаркі. Пытаньне гэта можа быць вырашана ў значнай ступені шляхам укараненьня жаночай працы як у прамысловасьць, так і ў сельскую гаспадарку.

Ужо ў сучасны момант новыя масы працоўных жанчын уцягваюцца ў сацыялістычнае будаўніцтва. Вырасла і колькасьць жаночай рабочай сілы ў швэйнай прамысловасьці Менску. Таму востра паўстала пытаньне перад усімі арганізацыямі аб **пашырэньні сеткі бытавых устаноў**. Да гэтага часу пабудова бытавых устаноў значна адстае ад росту сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта перашкаджае максымальнаму ўцягненьню жанчын у прамысловасьць і адбіваецца на недавыкананьні прамфінпляну па швэйнай прамысловасьці, на цякучасьці работніц і прагулах.



Брыгадзір дае ўказаньні маладой работніцы

Швэйныя фабрыкі маюць усе мачымасьці ня толькі выконваць, але і перавыконваць свае прамфінпляны. Ня гледзячы на гэта, толькіфабрыкі імя Крупскай і „8 сакавіка“ з усіх швэйных фабрык БССР выканалі свае прамфінпляны. За апошнія месяцы фабрыка „Кастрычнік“ ня выходзіць з прарыву, выконвае прамфінплян толькі на 85 проц.

Нашы фабрыкі налічваюць у сваім складзе 65 проц. работніц. Незабясьпечанасьць работніц бытавымі ўстановамі—яські, дзіцячыя сады, сталоўкі, пральні—стварае цякучасьць у галоўнай пераважнасьці за лік работніц-матак.

Мы, работніцы-маткі, не жадаем пакідаць фронт сацыялістычнага будаўніцтва. Мы вырасьлі палітычна, прымаем актыўны ўдзел у сацспаборніцтве і ўдарніцтве і не жадаем зноў варочацца да старога кухоннага быту. Інтарэсы сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць **100 проц. удзелу ўсіх працаздольных жанчын у вытворчасьці, таму мы патрабуем стварыць для гэтага неабходныя ўмовы.**

Канфэрэнцыя патрабуе, каб усе дзіцячыя ўстановы гораду былі пастаўлены на службу выкананьня прамфінплянаў фабрык і заводаў, для чаго патрэбна прыстасаваць іх да ўмоў вытворчасьці, да ўмоў вытворчай і грамадзкай працы работніц. **Дзіцячыя ўстановы павінны быць пераведзены на дзьве зьмены з тым, каб дзеці знаходзіліся ў яськях 10—12 гадзін.** Дзеці, маткі якіх працуюць на 2-ой зьмене, павінны заставацца ў яськях на ўсю ноч і толькі раніцой забірацца адтуль. **Неабходна скончыць будаўніцтва яськяй пры фабрыцы „Кастрычнік“ не пазьней 15-га верасьня г. г., адкрыць яські пры фабрыцы імя Крупскай з разьлікам абслугоўваньня і дзяцей работніц фабрыкі „8 сакавіка“.**

Мы, работніцы-ўдарніцы, просім ВСНГ, ЦСПСБ НКСнаб, гарсавет вылучыць дадатковыя сродкі на паляпшэньне харчаваньня дзяцей.

Сталоўкі, яські, дзіцячыя сады і інш. павінны стаць цэхамі прадпрыемства.

Мы просім гарпрафсавет склікаць у бліжэйшы час нараду гаспадарнікаў прадпрыемстваў (дзе больш ужываецца жаночая праца), сумесна з прадстаўнікамі гарсавету, гарАНА, Гарздраву, НКПрацы, ВСНГ і ЦРК і абгаварыць нашы прапановы.

Нельга далей цярпець адарванасьць нашых дзіцячых устаноў ад задач нашага сацыялістычнага будаўніцтва і выкананьня плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Удзельніцы канфэрэнцыі прымаюць выклік работніц фабрыкі „Кастрычнік“, якія ўзялі на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Аказаць максымальную дапамогу органам асьветы і аховы здароўя ў практычным ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў па прыстасаваньні дзіцячых устаноў да ўмоў нашай вытворча-грамадзкай працы.
2. Вылучыць 30 лепшых ударніц для абсьледваньня бытавых устаноў з пункту погляду магчымасьці хутчэйшага пераходу на 2-зьменную працу, ліквідацыю абязьлічкі, прымацаваўшы яські да асобных прадпрыемстваў.
3. Вылучыць 10 лепшых работніц для працы ў дзіцячых установах.
4. Абвясьціць сябе ўдарніцамі на фронце барацьбы за паляпшэньне працы сацбытавых устаноў і бытавых умоў рабочых і работніц.

Гэтыя абавязацельствы бярэм на сябе ўсе мы—работніцы ўсіх швэйных прадпрыемстваў г. Менску.

Прэзыдыум канфэрэнцыі работніц-ударніц швэйнай прамысловасьці гор. Менску.

Ударым па апартуністычнай недаацэнцы задачы разгортваньня дзіцячых устаноў

Патрабуем увагі дзіцячай пляцоўцы

У калгасе „Чырвоны будаўнік“ адкрылі дзіцячую пляцоўку. Здавалася-б, што гэта пляцоўка павінна была атрымаць дапамогу з боку праўленьня калгасу, бо яна-ж дапамагае поўнаму выхаду калгасьніц на работу і лепшаму выхаваньню дзяцей. Але ня так думае старшыня калгасу Жыгмунт.

„Навошта пляцоўка. Без яе спакайней“. Ён і слухаць ня хоча, калі да яго з чым-небудзь звараčаецца камсамолка—кіраўніца пляцоўкі.

Ужо месяц, як адкрыта пляцоўка, а харчаваньне для дзяцей не наладжана. Дзеці ходзяць дамоў абедаць. Старшыня Жыгмунт нават дадумаўся да таго, што на дварэ пляцоўкі паставіў аграмаджаную жывёлу і дзецям няма куды выйсьці з хаты.

Трэба хутчэй узяцца за аздараўленьне і паляпшэньне ўмоў працы пляцоўкі.

Праходжы.

Лепельскі раён.

Рэдакцыя патрабуе ад праўленьня калгасу тэрміновага адказу, што зроблена для аздараўленьня ўмоў працы пляцоўкі і наладжаньня харчаваньня дзяцей.

Сарвалі адкрыцьцё ясьляй

У калгасах „Полымя“ і „Новы мір“, Рагоўскага сельсавету, намечана было адкрыць у гэтым годзе ясьлі. Але праўленьні гэтых калгасаў не знайшлі патрэбным паклапаціцца аб гэтым. Таму не знайшлі памяшканьня і ня выдзелілі сродкаў.

А таго ня бачаць праўленьні, што з-за адсутнасьці ясьляй і пляцовак многія жанчыны ня выходзяць на работу, што спрыяла позьняй уборцы сенажаці і ўборцы азімых і яравых культур у калгасе „Полымя“.

Пара праўленьням калгасу падумаць над тым, каб стварыць умовы для поўнага выхаду калгасьніц на работу.

Заслаўскі раён. **Русовіч В.**

Ясьлі арганізаваць неабходна

Ня гледзячы на дырэктывы партыі і ўраду аб адчыненьні ясьляй, праўленьне калгасу „Прамень касца“ не паклапацілася забясьпечыць выкананьне гэтай важнейшай дырэктывы, што вельмі дрэнна адбілася на працы ўборачнай, бо жанчыны не маглі выйсьці на работу. Неабходна на час асеньняй пасеўнай кампаніі адкрыць хоць часовыя ясьлі.

Зорка.

Плешчаніцкі раён.

Дзеці ў ясьлях—калгасьніцы на рабоце

У калгасе „Чырвоная зорка“ арганізаваны ясьлі для дзяцей. Калгасьніцы - ўдарніцы здаюць дзяцей і працуюць цэлы дзень бяз клопату. Дзеці ў ясьлях даглядаюцца добра, усім забясьпечаны.

Алесь Шпакоўскі.

Любаньскі раён.

Закрытая сталоўка швэйнай фабрыкі „Кастрычнік“.



Ясьлі ў калгасе (Сібір).



Лён

Апавяданьне

В. Галіна

Шустра сонечны прамень прасьлізнуўся скрозь кудлатую галаву алешыны, саскочыў на траву, і далей, па пяску залатым пакаціўся к Прыпяці ўмывацца. Прыпяць пазяхнула спрасонку, высока ўзьняла грудзі, уздрыганулася. Насустрач водам яе набягала высачэзная хваля. Наўкасяк хваля перахапіла раку, пасьля распрасталася, ляснула аб бераг, ва ўсе бакі рассыпала празрыстыя пырскі. Уздагон за першай хваляй пабегла другая, трэцяя. Грудзі ракі ў берагох, бы гармонік у разудалых руках. А за мехам гармоніка, з-за касы, што ўразалася ў воды, капрызна згінаючы плынь, „гу-у-у-оў“,— сіпла, працяжна кашлянуў параход, крутануўся і прыстаў к берагу.

На бераг споўз Зусь. У горад ён напэўна езьдзіў па тавары для сваёй арцелі з пяці шаўцоў. Спадарожнікамі Зусевымі былі: Платон Караўкоў, — гэта дзед, які ўвесь свой век на плытох зьвекаваў. Быў ён у Кіеве, у Кацерынаславе. Апошнім, штурхаючы перад сабою скрыню, перавязаную вяроўкамі, вылез малады русы мужчына ў белай кепцы і вайсковай шынэлі.

Сваю паклажу мужчына адцёг вышэй, разагнуўся, агледзеў бераг. Скмеціў ён курэнь на касе і здалёк—сьпіны яго спадарожнікаў: Зусі і Караўкі. Больш нікога на рынку ня было, калі ня лічыць дзьвёх чаек. Але чайкі толькі раз мігнуліся над берагам, загнулі дужку і нырнулі ў паветра над вадою.

Прыежджы ўзяў паклажу і пашоў да курэню.

— Ёсьць хто?— запытаў ён, прасоўваючы галаву.

— Чаго трэба?

З курэню вылез пануры, заспаны чалавек. Убачыўшы незнаёмага, ён падцягнуў штаны вышэй і згроб з вачэй рудыя, як жар, валасы.

— Я папрасіў-бы паберагчы маю паклажу.

— Будзьце ласкавы. Толькі не на доўгі час,—адказаў руды. Відаць і на гэтым глухім беразе ад падарожнікаў пераняў ён такі ветлы зваротак.

Прыежджы прысеў на абернутую лодку, к сонцу падставіў рудыя плечы.

— Што тут робіш?

— Што нам рабіць... на пароме.

Памаўчалі.

— А вы здалёк будзеце?

Госьць усміхнуўся.

— З гораду зараз еду.

Руды навастрыў вушы.

— Гарадзкія... Тэк, тэк-тэк... Пра што-б я хацеў даведацца ў вас...

— Ну, ну?

— Вось, калі чалавек бяз ніякай спэцыяльнасьці, ці прымуць яго ў горадзе ў прафсаюз?

— Што рабіў да парому?

— Батрачыў я.

— Цябе, вядома, прымуць у воднікі. Ёсьць тут блізка рабачком?

— Ды я зусім не пра сябе.

— А-а... — Прыежджы зацікавіўся.—Тады гледзячы які чалавек—кім быў раней, дзе працуе, як працуе. Ты лепш скажы, што за чалавек.

— Так сабе, нашы вясковыя справы.

Паромшчык замяўся, пасьля зірнуў на шынэль падарожніка.

— Быў тут у Ракітаўцы нехта, адно слова—гад. Жывучая п'яўка. Яму-б месца далёка, каб і нага тут не сьмярдзела. Дык не. Зімою і летам жыве, толькі вопратку зьменіць. Зараз—сын у прафсаюзе, бо бацька з сям'ёю ў калектыве, а бацька ў калгас улез, бо сын прафсаюзьнік. Так адно другога і пакрывае.

— Хто такі?

— Кожны пальцам паказвае на яго. Можа заедзеце ў калгас, даведаецеся. А не, то і я расказаць не пабаюся.

— Так.

Прыежджы дастаў „Басму“, закурыў, паромшчыка пачаставаў.

— Што ў рабоце чуваць у вашым калгасе,—і замяўся. Пасьля дадаў—ведаеш?

— Як ня ведаць. Я і сам калгасны: калектыў паставіў мяне сюды, на паром.

А калгас наш што... У гару бярэмся, упарта... Засеялі ого-го! Касавіца зараз. А галоўнае з ільном, вось дзе ўся закавыка. Так і людзі ўсе ў адзін голас. Ільну, браце ты мой, людзі дзівяюцца. Дзяды зроду ня думалі, што тут ільну столькі сеяцьмуць. А парос, каб ты бачыў, як лес! Зараз пасьпявае лянок, пара яго падыходзіць. Хутка і рваць пара. Пасьля мачыць, слаць. А ў кожнага-ж толькі дзьве рукі, ня больш. І вышэй носу не падскочыш. Калісь баба над загончыкам ільну і то квокча ўсю восень. А тут...

— З пасевам управіліся?

— Э, тут дні гарачыя былі, ведалі—не засеем, другія зааруць. А зараз...—паромшчык устаў і зноў угару штаны скубянуў,—ні то каб ахвота адпала, а людзі ня ўсе роўныя, хоць-бы і ў тым самым калектыве: адзін, як сабе дбае, а другі ледзь калываецца, хавае ў думках: „Хоніць на рукі мукі“. Так яно і выходзіць.

А людзі пазіраюць: што з нас будзе. Што будзе? Чыстка патрэбна. Тое будзе. Ёсьць у нас такія калектыўшчыкі, што ня то рукамі, зубамі ўчапіліся, назад ні мур мур, ні паўкрока. У-ух, настойлівы, упарты народ! Што вы думаеце, так і нехацімцы мяркуюць: „Ня сёньня, дык заўтра“. Туды яно ідзе, у той бок шлях завярнуўся. Толькі парадку больш трэба.

—Ого-го-о-ох!—гукнулі з таго берагу.

Руды ўхапіўся за скрыню прыежджага.

— Грошы тут, ці якая бяда? Бы ў зямлю ўросла.

Разам падхапілі і ўнесьлі паклажу ў курэнь.

— Мы пад‘едзем змрокам.

— На доўга ў Ракітаўку?

— Як затрымаеце, ці палюбіце,

— Я і забыў,—схамянуўся руды,—сусед да мяне абяцаў завярнуць з сенажаці, то мы за адно падвязем вашу паклажу. Куды пад‘ехаць?

— Вельмі добра, дзякуй. У Трахіма я, буду, мабыць.

Руды яшчэ раз зірнуў на госьця, мусібыць падумаў, адкуль прыежджы Трахіма ведае.

— Гэта ў Шворана Трахіма?

— У яго.

— А мо‘ пачакайце крыху? Ня інакш Ракітаўцы з таго берагу перепрапляюцца. Калі паклажа ў іх невялікая, падвязуць і ваша, а то боязна мне пільнаваць: адвернешся, мала чаго можа быць, каб хто рук не пагрэў.

Не дачакаўшыся згоды, руды кінуўся да парому.

II.

Вёска Ракітаўка да грудка туліцца. Скрынкамі прышпілены хаткі да грудка. Ракітаўка—грудок, за грудком пяскі, палі, сенажаці. А між грудком і пяскамі адвечная лужына. І дажджу няма, а лужына зроду не перасыхае. Перад захадам сонца над лужынай мошкі „мак таўкуць“. Разганяе машкару стада. Месяць гразішча стада і пастухі. Рэмзат, плёскат, штурхатня.



— Дык гэта ты „дзядзька“? Які вецер прынёс?

Галасы нараджаюцца далёка, між палямі, лагчынамі. Па дарозе, у сівай заслоне пылу, галасы нарастаюць, зьліваюцца ў адзін рэмзат, праз лужыну ўрываюцца ў вёску.

Такою парою, калі над самым лесам павісла пазалочанае сіта, Уладзік выбег насустрач бацьку.

— А ў нас дзядзька з гораду. Глянь, які аловак мне даў.

Трахім прывык да гасьцей. Ён адвёў у стайню каня, прайшоў пад гумно, пасварыўся на дзяцей за тое, што ў студню каменьні шыбалі, жонцы Апанаса наказаў, каб прыслала да яго мужа, і толькі тады ўвайшоў у хату.

— Здароў, здароў, Андрэй! Дык гэта ты „дзядзька“? Які вецер прынёс?

— Ня вецер, а ногі ўласныя, з прыстані. Я думаў і ты не пазнаеш мяне.

— Аблупленага пазнаю. Даўно тут?

— З раніцы. Аглядаў вашы хлявы, гароды, у поле праходзіў. Ну і лянок: сьцяна сьцяною! вышэй пояса!

У адказ Трахім толькі расплыўся ў шчасьлівай усьмешцы, якая доўга не раставала на яго смуглявым твары.

— Кажуць, старыя ня памятаюць такога ўраджаю.

— Дзядзька, а Лук‘яніха бабка раней казала: „Градам паб‘е калгаснае“, а зараз намаўляе: „Анціхрыст у прыманку наслаў такі ўраджай“. Цёткі сьмяюцца з яе, а старыя бывае і заплачуць.

— Палюбуйся маім піянэрам,— пахваліўся Трахім. А да сына:— Бяжы ў клюб, там цябе ў атрад клікалі.

Неўзабаве Трахімава жонка частавала гасьцей маласольнымі. За сталом Андрэй апавядаў:

— Завод выправіў. Не на доўга: месяцаў на 2—3 дапамагчы. Дзесяць дваццаціпяцітысячнікаў апрача мяне паслалі, арудуюць, аж гай гудзе. Цяпер, як запыталі добрахвотнікаў часова выехаць, я сам адпрасіўся ў свае краі. Думаю прымеце.

— Ой, браце, работа адна другую насьцігае. Старшыня ў нас — Апанас. Ніштo хлапец, толькі вялы і мяккаваты.

Адчуваю я іншы раз, што ня ўсё ў нас адно да другога горнецца. Камуністаў у нас усяго чатыры ды камсамольцаў сем. Актыў слабенькі. І з гэтымі ўвесну за вушы выратавалі калгас. Ты ведаеш, спачатку ўсе папісаліся, а пасьля Сашка Чубаты—сакратаром да мяне быў ён—паніку навёў. „Зганяй, кажа, усіх як ёсьць кароў, авечак, сьвіней і нават курэй у адзін гурт“.

— Зганяць, куды?—людзі пытаюць.

— Хлявоў няма—у кашару.

Так загнаў, што і дасюль ня вычухалі ўсяго. Загагакалі людзі, хто што хацеў крычаў пад шумок. Мірон выпісаўся, за ім другія шарахнуліся. Толькі ў самую сяўбу сорак дзевяць гаспадарак у калгас павярнулі. Ведаем мы, што і цяпер падбіваюць некаторых: „Ураджай зьбяры і лахі пад пахі з калгасу“!—нагаварваюць.

— Ну, а вашы што на гэта?

— Нашы што. З вачэй гоняць такіх сватоў. Да нас у калгас прыдуць, а ня мы з калгасу пойдзем, адказваюць, бо год назад не варочаецца.

Андрэй прысеў і далоньню прыціснуў на парэнчу ложка.

— Як адзін?

Трахім задумаўся.

— Пажывеш, пабачыш, прыгледзішся. А пакуль... Мне ўчора ў райкоме партыі кажуць: „Ты сакратар парт'ячэйкі. Ты адказваеш. Клясавая лінія. Я ведаю, з першых гадоў рэвалюцыі ведаю, з фронту, што значыць клясавая лінія.

Выразны клясавы падыход павінен быць ад пачатку да канца ва ўсёй рабоце. Ад лініі партыі нельга адхіліцца ні на паўкрока.

Трахім перадыхнуў, абцёр пот з ілба, вылез з-за стала.

— Выйдзем, пасядзім на парозе. А вось і Апанас. Сядай.

— Сьпешнае што? А то я хацеў загадаць работу на заўтра людзям.

— Пагутарым з Андрэем, прыехаў да нас ён часова?

— Управімся пагутарыць. Заўтра будзеш тут?

— Ня толькі буду, а ўлічы там, разьмяркоўваючы людзей, што на сенажаць і я пайду.

— Ад гэтага мы ніколі не адмовімся. А пагаворым заўтра.

Апанас вышаў.

— Іншы раз,—гаварыў далей Трахім,—складзецца такі пераплёт, што і чорт нагу зломіць. Вочы вылазяць на лоб. Мяркуеш, як правільней зрабіць, каб ні на нітачку ў бок ня зьвіхнуць. Мазгі за мазгі чапляюцца.

Лён пасьпявае. Пагаворым у ячэйцы. Ільнаўборка гэта на гару ўзьбіраецца, падужаем—козыр у нашых руках.

Трахім доўга апавядаў прыяцелю, выкладаў думку за думкай. І думкі тыя ўсе у адным ланцужку, адна за другую ўчэплены. Так многа іх наскладалася недзе. З глыбіні, па аднэй яны падавалі: голас, па-рознаму аб'сабе знаць давалі: шушукалі, пелі, крычалі, патрабавалі, а бывала напорыста разьдзіралі нутро. Зараз усе па чарзе і без чаргі яны вырываліся, выказваліся ў словах радасьці, трывог і перамог.

Калі скончыў Трахім... Ды дзе там скончыў! Трывогам, радасьці і перамогам няма канца краю, няма ім мяжы. Трахім толькі перапыніў споведзь сваю. І здалося Трахіму, што згрузіў ён з плеч цяжэнную ношку. Стала лягчэй. Трахім разагнуўся. Разагнутаму відней стала далеч, выразьнейшая далеч стала. А да выразнага сьмялей крок, да яго можна ня толькі ісьці, а і бегчы.

— Пара адпачываць. У хаце духата. Жонка ў сенцах паслала табе. Дабранач!

Андрэй прысеў і далоньню націснуў на парэнджу ложка.

— Як бачыш, зноў вёска, дзе радзіўся, падрос,—сам з сабою разважаў Андрэй.— Старэнькая маці была тут, памерла. Адзін застаўся, як палец. Пасьля ў армію пашоў. Скончыў службу. Чаго варочацца ў Ракітаўку, да каго? Застаўся ў горадзе, на заводзе. У партыю ўступіў. Зараз зноў памагчы прыехаў. А Ракітаўку не пазнаць. Суседзі былі проста сяляне, а цяпер—калгасьнікі. Ну, братаны, дапамагу, колькі сілы хопіць. Наказ заводзкіх—закон!

Праз адчыненыя дзьверы сянец з неба чорнага з сінім водбліскам зоры мігацелі. Здалося Андрэю, што неба—двор заводзкі, а зоры—лямпкі электрычныя. Якраз так бліскалі агні, калі ўночы некалькі сяброў паўз завод праводзілі Андрэя на станцыю. Толькі зараз ціха ў небе, а завод грукацеў. З дзінькатам пырскалі іскры драбнюткія апілкі жалеза; у пракатным згіналіся, паўзьлі па зямлі, над галовамі махаліся агністыя зьмеі—рэйкі.

Успомніўся прарыў на заводзе, лепшы дружака-ўдарнік ліста-пракатнага—Сашка Яршоў.

У Сашкі вочы—лучынкі смольныя. Ён так з прарывам спраўляўся: выйдзе на працу да гудка, узьлезе на стос бляхі.

Братва, у нашым цэху ўсе бязвусыя, на палову акамсамолены цэх. Ці мы-ж дапусьцім ганьбу! Гэй, хто больш?!

Разам з гудком Сашка брызьне да варшруту.

„Чым — бразь, чым— бразь,— шыбае Сашка жалезныя лісты. За Сашкаю другі, трэці. За Сашкаю ўвесь цэх. Вочы не пасьпяваюць за рукою, зацягнутаю ў раменную рукавіцу. Разам з Сашкаю ліста-пракатны адваяваў пераходны сьцяг.

„Чым—бразь, чым—бразь“— ляскае ў вушах Андрэя. Андрэй цягнецца к зорам.

Раз! раз...—закасаў рукавы.

— Вось так, як Сашка, у брыгады ўдарныя ўвесь калгас „Іскра“.

За сьцяною нехта шушукаўся. Андрэй пазнаў жаночыя галасы.

— Кажуць, тут у Трахіма спыніўся?

— Высокі, прыгожы такі.

— А мо' жанаты?

— А хто яго...

Галасы замоўклі. Пад хатаю рассыпаўся малады дзявочы сьмех, а сьледам сакавіты голас зацягнуў:

Ці ў цябе ўдалы
Сакаліны вочы,
што не баішся
цёмнае ночы.

Далейшыя словы песьні расплыліся. Падушка прыцягнула да сябе Андрэеву галаву.

(*Працяг будзе*).

Парады доктара

Санмінімум у сталоўках

Вельмі важным вучасткам быту зьяўляецца паляпшэньне культурна санітарнага абслугоўваньня шырокіх працоўных мас. Неабходна памятаць, што пасьпяховая барацьба з цякучасьцю, барацьба за прамфінплян немагчыма без чыстаты ў цэху, у сталоўцы, у рабочым пасёлку—без захаваньня санітарнага мінімуму.

Санітарны мінімум—прасьцейшыя аздараўленчыя мерапрыемствы, якія праводзяцца пры шырокім удзеле працоўных мас на падставе ўдарніцтва і сацспаборніцтва. У гэтым артыкуле мы спынімся на санмінімуме ў сталовых.

Правільна пастаўленае грамадзкае харчаваньне ў належных санітарна гігіенічных умовах спрыяе павышэньню працаздольнасьці рабочых, а гэта дапамагае выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну.

Сталоўка павінна быць цэхам прадпрыемства. Адзначым самыя простыя мерапрыемствы па санмінімуме ў сталовых, якія распрацаваны санітарнай станцыяй і домам санасьветы:

1. У сталоўцы неабходна зрабіць дробны бягучы рамонт: пабелка сьцен і столяй клеевай фарбай.

2. Трэба забясьпечыць яе належнай вэнтыляцыяй (форткі, фрамузы, паправіць электрычныя вэнтылятары).

3. Накрыць абедзеныя сталы цыратай.

4. Забясьпечыць выстарчальнай колькасьцю начыньня.

5. Арганізаваць магчымасьць мыць начыньне ў гарачай праточнай вадзе, у 3-х водах, для чаго зрабіць адпаведныя прыстасаваньні. Чыстае начыньне хаваць у шафах.

6. Сачыць за сваячасовым мыцьцём начыньня і чыстатой кухні.

7. Для зьбіраньня кухонных адкідаў паставіць пасуду са шчыльна прыкрываючай накрыўкай, сваячасова выносіць адкіды.

8. Уборка памяшканьня: штодзенна мыць падлогу, панэлі, афарбаваныя алейнай фарбай, мыць гарачай вадой. Падмятаць абавязкова вільготным спосабам пасьля працы (а ня ў часе яды). Рабіць агульную ўборку памяшканьня, выціраць пыл, павуціньне ня менш аднаго разу ў 5-днеўку.

9. Забясьпечыць абедзеныя залі плявальніцамі і вурнамі.

10. Забясьпечыць гатаванай вадой.

11. Забараніць курэньне ў сталоўках.

12. Не заклейваць сьцены рознымі абвесткамі, для апошніх трэба мець вітрыны пад шклом.

13. Вывесіць санітарна-асьветныя лёзунгі пад шклом ці на спэцыяльных фанэрных дошках.

14. Хаваньне прадуктаў: забясьпечыць кладовыя накрыўкамі і засекамі і г. д, забясьпечыць ільдом, забясьпечыць месца для хаваньня гародніны з захаваньнем адпаведнай тэмпэратуры.

15. Забясьпечыць магчымасьць наведвальнікам зьняць верхнюю вопратку і ачысьціць абутак ад бруду.

16. Працаўнікі сталовай павінны насіць чыстую адпаведную спэцвопратку.

17. Брудная скарыстаная бялізна павінна захоўвацца асобна ад чыстай.

18 Забясьпечыць магчымасьць мыцьця рук для наведвальнікаў і пэрсаналу.

19. Работнікам сталовай акуратна наведваць мэдагляд.

20. Весьці барацьбу з мухамі, тараканамі і грызунамі. Завесіць вокны на летні час сеткамі. Прыняць меры супроць трапляньня ў памяшканьне грызуноў (рамонт падлогі).

21. Рабіць дэзын'экцыю памыйных ям, сьметнікаў і дваровых прыбіральняў хлёрнай вапнай, вапнавым малаком.

Сачыць за сыстэматычным вывазам нячыстот.

22. Садзейнасьць і кантроль у правядзеньні гэтых мерапрыемстваў у сталовых ускладаецца на санітарныя камісіі, сац.-бытавыя сэктары ФЗМК, жактаў і райвыканкомаў.

Кіраўніцтва ўскладаецца на раённага санітарнага доктара і доктара мэд. пункту на прадпрыемстве.

Неабходна памятаць, што чыстата ў сталоўках забясьпечвае добраякаснасьць прадуктаў і паніжае захворваньне рабочых.

Санмінімум аздараўляе працу і быт. Уключайце выкананьне санмінімуму ў дагавор сацспаборніцтва.

Працоўныя жанчыны, усе на барацьбу за чыстату, за выкананьне прамфінпляну.

Д р Нейфах.

ШТО ЗРОБЛЕНА ПА ДОПІСАХ РАБСЕЛЬКОРАК

Старшыня калгасу зьнят з працы

Факты, якія паказаны ў допісу пра вёску Карпілаўку, усе пацьвердзіліся. Старшыня калгасу зьнят з працы. Голубу Навуму зроблена апошняе папярэджаньне, пасьля якога, калі факты будуць паўтарацца, ён будзе выключан з калгасу.

Зьмянілі старшыню калгасу „Зьвязда"

На допіс калгасьніцы „Замест старшыні пустое месца" Крупскі райкалгассаюз паведамляе, што кіраўніцтва з боку праўленьня калгасам сапраўды было кепскае, за што старшыня калгасу зьнят з працы і заменен другім.

Лістано сец Купрэйчык выключан з камсамолу

Факты аб зьдзеках лістаносца Купрэйчыка над падпісчыцай часопісі „Беларуская работніца і сялянка" тав. Плевака пацьвердзіўся.

Купрэйчык выключан з камсамолу, справа накіравана ў судовыя органы.

Старшыня Струкачэўскага сельсавету Лапухоў атрымаў партспагнаньне

Кармянскі РВК паведамляе, што допіс аб тым, што ў Струкачэўскім сельсавеце меліся выпадкі кепскага прыёму наведвальнікаў, неэтычныя паводзіны з боку старшыні сельсавету пацьвердзіліся. Старшыня атрымаў партыйнае спагнаньне.

1366

Старонка ручной працы

Вышыўка сукенкі ці рускай рубашкі. На суровым палатне ці белым вышываюцца калосьсі—жоўтыя, молат—чорны, сэрп—шэры і ручка—карычневая. Калосьсі лепш вышываць двума колерамі—жоўтым і цёмна-жоўтым, ці сьветла-карычневым па чарзе: верхні колас—сьветлы, ніжні—цёмны, верхні—цёмны, ніжні сьветлы.



Вышыўка для рускай рубашкі: калосьсі і васількі вышываюцца гладзьдзю. Васількі вышываюцца ніткамі двух адценьняў, калосьсі, сьцеблі, зерні — цямней, асьцё—сьвятлей. Вышыўка робіцца шоўкам.

Вышыўка для гарнітурчыка ці дзіцячай сукенкі. Усе лініі—шэрыя, кружкі—белыя і чырвоныя, квадрацікі—блакітныя.



Вышыўка крыжыкамі.

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
БЕЛАРУСКАЯ
РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОІ № 11.

Выданьне **ЦК КП(б)Б.** *Рэдактар* **Э. Шапіра.**

Друкарня імя Сталіна Заказ № 1788. У друку **вкз.** 9.950 Галоўлітбел № 434